# Фармуляр аб далучэнні да Пагаднення Мэраў

Я, Дубовік Аляксандр Міхайлавіч, старшыня Дзятлаўскага раённага выканаўчага камітэта, упаўнаважаны Дзятлаўскім раённым Саветам дэпутатаў падпісаць **Пагадненне Мэраў па Клімаце і Энергіі**, цалкам усведамляючы абавязанні, выкладзеныя ў афіцыйным Дакуменце Пагаднення і падсумаваныя ніжэй.

Адпаведна, мой мясцовы орган улады перадусім абавязваецца:

- Скараціць выкіды $CO_2$ (і, магчыма, іншых парніковых газаў) на сваёй тэрыторыі, прынамсі на 30% да 2030 года, а менавіта дзякуючы паляпшэнню энергаэфектыўнасці і росту выкарыстання аднаўляльных крыніц энергіі;
- Павысіць жыццяздольнасць шляхам прыстасавання да ўплыву кліматычных зменаў.

З мэтай пераўтварэння гэтых абавязанняў у дзеянні, мой мясцовы орган улады абяцае прытрымлівацца наступнага пакрокавага падыходу:

- Падрыхтаваць **Базавы кадастр выкідаў** і правесці **Ацэнку рызык і ўразлівасці да змены клімату;**
- Прадставіць **План дзеянняў па ўстойліваму энергетычнаму развіццю і клімату** цягам двух гадоў пасля названай вышэй даты прыняцця рашэння гарадскім саветам, і **ўкараняць ідэі па змякчэнню наступстваў змены клімату і адаптацыі** ў адпаведныя палітычныя дакументы, стратэгіі і планы;
- **Рабіць справаздачы аб рэалізацыі** прынамсі кожныя два гады пасля прадстаўлення Плана дзеянняў па ўстойліваму энергетычнаму развіццю і клімату з мэтаю ацэнкі, маніторынгу і праверкі;
- **Абменьвацца** нашым бачаннем, вынікамі, вопытам і ноу-хау з іншымі мясцовымі і рэгіянальнымі органамі ўлады ў межах ЕЗ і па-за ім, шляхам непасрэднага супрацоўніцтва і раўнапраўнага ўзаемадзеяння.

Я прызнаю, што мой мясцовы орган улады будзе адхілены ад дадзенай ініцыятывы на падставе папярэдняга пісьмовага паведамлення з боку Офіса Пагаднення Мэраў – Усход, у выпадку, калі названыя вышэй дакументы не будуць прадстаўленыя (гэта значыць, План дзеянняў па ўстойліваму энергетычнаму развіццю і клімату ды Справаздачы аб рэалізацыі) цягам акрэсленых часавых рамак.

Жыдко Андрэй Паўлавіч, намеснік старшыні выканкама, Дзятлаўскі раённы выканаўчы камітэт, г. Дзятлава, вул. Леніна, 18, Novo-s@mail.ru, +375 (1563) 6-12-59, +375296997741

Старшыня Дзятлаўскага раённага выканаўчага камітэта — А. М. Дубовік

ДЗЯТЛАЎСКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ ГРОДЗЕНСКАЙ ВОБЛАСЦІ
РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ